Весці БДПУ. Серыя 2. 2016. № 4. С. 68–72

УДК 94(476):27"192/193"

# ГІСТОРЫЯ ХРЫСЦІЯНСКІХ КАНФЕСІЙ БЕЛАРУСІ Ў 20–30-я гг. ХХ ст. У ПРАЦАХ ЭМІГРАНЦКІХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

**С. Ф. Верамееў,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ГГУ імя Ф. Скарыны*

UDC 94(476):27"192/193"

# HISTORY OF CHRISTIAN CONFESSIONS OF BELARUS IN THE 20-30S OF THE XX CENTURY IN THE WORKS OF EMIGRANT RESEACHERS

**S. Verameyeu,**
*Candidate of History, Associate Professor of the Department of History of Belarus, GSU named after F. Skaryna*

Паступіў у рэдакцыю 18.10.16.

Received on 18.10.16

У артыкуле прааналізаваны працы беларускіх эмігранцкіх даследчыкаў, прысвечаныя гісторыі хрысціянскіх канфесій на тэрыторыі Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст. (І. Касяк, А. Мартас, Ч. Сіповіч, А. Надсан і інш.). Вылучана асноўнае кола пытанняў, якія разглядалі ў сваіх працах эмігранцкія даследчыкі. Адзначана, што звесткі па гісторыі хрысціянскіх канфесій прысутнічаюць ва ўспамінах беларускіх эмігрантаў. Аўтар артыкула робіць выснову, што недаступнасць архіўных матэрыялаў для вывучэння з боку эмігранцкіх даследчыкаў з'яўлялася сур'ёзнай перашкодай для больш глыбокага і дэталёвага вывучэння мінулага.

*Ключавыя словы:* эміграцыя, Праваслаўная царква, Каталіцкая царква, Унія, гістарыяграфія, Беларусь, эмігранцкія даследчыкі.

This article analyzes the work of the Belarusian emigrant research on the history of Christian confessions in the territory of Belarus in the 20-30-s of the twentieth century (I. Casiak, A. Martos, Ch. Sipovich, A Nadson and others). It highlights the main range of issues that are considered in the works of emigrant researchers. It was noted that the information on the history of the Christian confessions is present in the memories of the Belarusian emigrants. The author concludes that the lack of access to archival materials for study by emigrant researchers was a serious obstacle for a deeper and more detailed study of the past.

*Keywords:* emigration, Orthodox Church, Catholic Church, Union, BSSR, Western Belarus.

У беларускай гістарыяграфіі налічваецца значная колькасць навуковых прац, прысвечаных гісторыі хрысціянскіх канфесій на беларускіх землях у 20–30-я гг. ХХ ст. Аўтарамі часткі з іх з'яўляюцца прадстаўнікі беларускай эміграцыі. Эмігранцкія гісторыкі, не абцяжараныя марксісцка-ленінскай ідэалогіяй, мелі значна больш магчымасцей для вывучэння канфесійнай гісторыі ў параўнанні з іх савецкімі калегамі. На эміграцыі склалася іншая традыцыя вывучэння мінулага і гісторыяпісання, якую трэба даследаваць, а існуючыя навуковыя напрацоўкі выкарыстоўваць дзеля стварэння больш поўнай і аб'ектыўнай карціны мінулага. Між тым, спецыяльных прац, у якіх разглядалася б эмігранцкая гістарыяграфія гісторыі хрысціянскіх канфесій у БССР і Заходняй Беларусі 20–30-х гг. ХХ ст., да гэтага часу не існуе. Выправіць гэты недахоп паспрабаваў аўтар дадзенага артыкула.

Адной з першых прац па гісторыі хрысціянскіх канфесій азначанага перыяду стала манаграфія беларускага эмігранцкага дзеяча Івана Касяка, выдадзеная ў 1956 г. у Нью-Ёрку [1]. На яе старонках аналізаваўся і перыяд 20–30-х гг. у гісторыі Праваслаўнай царквы. Галоўную ўвагу пры гэтым І. Касяк надае пераследу праваслаўнага духавенства і вернікаў у БССР у 20–30-я гг. ХХ ст. Ён не разглядае антырэлігійную палітыку савецкіх уладаў як суцэльны працэс, вылучаючы ў ёй пэўныя этапы: 1917–1920 гг.; 1928–1933 гг.; 1936–1937 гг. Падчас НЭПу, як адзначае аўтар, антырэлігійная барацьба аслабела, але ніколі не спынялася на ўсім працягу 20–30-х гг. ХХ ст. У працы закранаецца і праблема аднаўленцкага расколу ў Праваслаўнай царкве ў тыя часы. І. Касяк слушна адзначае, што абнаўленцы спрабавалі дапасавацца да савецкага рэжыму і абапіраліся на дапамогу савецкіх улад.

Становуча характарызуе І. Касяк мінскага праваслаўнага біскупа, пазней мітрапаліта Мелхіседэка, якога называе «добрым пастырам, здольным адміністратарам, карыстаўшымся вялікай пашанай у народзе». З Мелхіседэкам даследчык звязвае абвяшчэнне аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў БССР і датуе гэтую падзею ліпенем 1922 г. [1, с. 38–39]. У сваю чаргу, сучасныя беларускія даследчыкі, у тым ліку і царкоўныя гісторыкі, абвяшчэнне аўтаноміі адносяць да 1922 г., а абвяшчэнне аўтакефаліі – да 1927 г. [2, с. 158; 3].

І. Касяк адзначае, што савецкія ўлады змушалі Мелхіседэка прызнаць «саветафільскага мітрапаліта Сяргея, месцаахоўніка патрыяршага пасаду», але няма звестак, каб яны дасягнулі сваёй мэты [1, с. 40]. Між тым, у сучаснай гістарыяграфіі лічыцца, што Мелхіседэк прызнаў старшынство Сергія Страгародскага [2, с. 166].

Поўную ліквідацыю царкоўнага жыцця на тэрыторыі БССР І. Касяк адносіць да 1937 г. У працы змешчаны даныя аб колькасці знішчаных у тыя гады цэркваў, манастыроў, а таксама святароў. Аднак на думку даследчыка, нягледзячы на тое, што ў БССР не засталося дзеючых цэркваў, савецкія ўлады «не змаглі выкараніць асноў веры з душаў народу». Адзначаецца таксама, што падобны лёс напаткаў не толькі Праваслаўную царкву, але і Каталіцкую, суполкі пратэстантаў і інш. Пры гэтым улады імкнуліся знішчыць і так званую хрысціянскую ўрбаністыку – дамінаванне храмаў над гарадскімі будынкамі, а таксама знішчалі рэлігійна-нацыянальныя помнікі ў БССР з мэтай, як лічыў І. Касяк, пазбаўлення беларускага народа нацыянальных традыцый і гісторыі [1, с. 40–42].

У асобным раздзеле працы І. Касяка разглядаецца гісторыя Праваслаўнай царквы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Даследчык раскрытыкаваў палітыку польскіх уладаў у адносінах да Праваслаўнай царквы, у тым ліку і рэвіндыкацыю, адзначыў непрыманне новага (грыгарыянскага) стылю з боку духавенства і веруючых. Ён звярнуў увагу на тое, што супраць польскай палітыкі ў адносінах да царквы выступалі беларускія паслы і сенатары (як праваслаўныя, так і каталікі), выбраныя адпаведна ў Сейм і Сенат ІІ Рэчы Паспалітай. У прыватнасці, аўтар цытуе выступленні сенатара В. Багдановіча, прысвечаныя складанаму становішчу Праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі, прыводзіць на старонках сваёй працы шматлікія факты, якія паказваюць цяжкае становішча, у якім апынуліся праваслаўныя вернікі пры польскай уладзе. І. Касяк раскрытыкаваў таксама і пазіцыю праваслаўнай іерархіі ў тых умовах. На яго погляд, іерархія і духавенства замест таго, каб супрацьстаяць паланізацыі, «абапёршыся на беларускіх рэлігійна-нацыянальных асновах», пайшлі на згоду з палякамі. Пры гэтым згадваецца, што беларускія нацыянальныя дзеячы прыкладалі намаганні па беларусізацыі Праваслаўнай царквы [1, с. 44–56, 66].

Даследчык адзначае, што Каталіцкая царква ў Заходняй Беларусі насіла нацыянальна польскі характар. На думку І. Касяка, канкардат, заключаны паміж Ватыканамі і польскім урадам у 1924 г., ператвараў Каталіцкую царкву ў прыладу паланізацыйнай палітыкі на заходнебеларускіх абшарах. Віленскага біскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага, які стаў на чале Віленскай дыяцэзіі ў 1926 г., ён называе «польскім шавіністам, які варожа ставіўся да беларускага нацыянальнага пытаньня» [1, с. 63]. Аднак нельга сцвярджаць, што І. Касяк разглядае Каталіцкую царкву выключна як інструмент паланізацыі. Ён прызнае, што сярод каталіцкага духавенства былі і нацыянальна свядомыя святары, указвае факт турэмнага зняволення польскімі ўладамі ксяндза В. Гадлеўскага [1, с. 43, 63–65].

І. Касяк прытрымліваўся адмоўнага пункту гледжання на Уніяцкую царкву. Звяртаючы ўвагу на невялікую колькасць уніяцкіх прыходаў і вернікаў у Заходняй Беларусі, ён тлумачыў гэта тым, што ініцыятары уніі дзейнічалі «не для дабра беларускага народу, а для сваіх мэтаў». Нельга пагадзіцца з высновай І. Касяка аб тым, што «беларусы не мелі ніякага нацыянальнага ўплыву» на унію [1, с. 57–61]. Вядомыя навукоўцам факты сведчаць пра адваротнае [4, с. 83–90].

У працы І. Касяка не застаўся без увагі аспект, звязаны са становішчам Праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі ў 1939–1941 гг. Адзначаецца, што ў гэты час мелі месца забойствы святароў, дэпартацыі, яны вымушаны былі плаціць вялікія грашовыя падаткі. Савецкія ўлады ў царкоўнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі абапіраліся на прарасійскі настроеных святароў, «вынішчаючы паланафілаў і ігнаруючы беларусаў» [1, с. 73–76].

У 1966 г. у Буэнас-Айрэсе (Аргенціна) была выдадзена праца беларускага рэлігійнага дзеяча, біскупа Апанаса Мартаса «Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни» [5]. А. Мартас – чалавек незвычайнага лёсу. Ён быў біскупам Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, потым, у 1946 г., у біскупскім сане перайшоў у юрысдыкцыю Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай царквы. Са жніўня 1946 г. ён з'яўляўся вікарыем Германскай епархіі РПЦЗ, а з пачатку 50-х гг. ХХ ст. стаў арцыбіскупам РПЦЗ у Аргенціне [6]. Публікацыя працы А. Мартаса вызвала шырокі розгалас сярод расейскага эміграцыйнага духавенства і вернікаў. У лістах і пратэстах яго называлі «актыўным ворагам Расіі» і заклікалі царкоўнае кіраўніцтва прыняць адпаведныя крокі ў яго адносінах. Адначасова праца А. Мартаса знайшла і прыхільнікаў, якія стварылі ў яго падтрымку Общество почитателей его Высокопреосвященства Архиепископа Афанасия». Аднак у выніку арцыбіскуп быў пазбаўлены пасады і адпраўлены «на покой», а рашэннем Сіноду РПЦЗ у верасні 1971 г. распаўсюджванне яго працы было забаронена [7, с. 12–13].

У працы А. Мартаса сярод іншых пытанняў разглядаецца становішча Праваслаўнай царквы на тэрыторыі БССР і Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Стварэнне Беларускай мітраполіі ў ліпені 1922 г. аўтар лічыць вынікам рэалізацыі пастановы патрыярха Ціхана і Сінода ад 7/20 лістапада 1920 г., згодна якой біскупы атрымлівалі больш паўнамоцтваў і правоў у справе ўладкавання царкоўнага жыцця ў падначаленых ім епархіях. А. Мартас адзначыў наяўнасць сярод беларускага духавенства моцнага імкнення мець незалежную ад Масквы царкву і свайго мітрапаліта, доказам чаму, на яго думку, з'яўляецца 1927 г. Аднак «советский погром» духавенства, як піша аўтар, гэтыя памкненні зруйнаваў. На старонках сваёй працы А. Мартас рэзка крытычна адазваўся аб абнаўленцах, якія, на яго погляд, нягледзячы на анафему патрыярха Ціхана, працягвалі сваю «разрушительную работу, пользуясь покровительством властей». У адрозненні ад І. Касяка, які адзначаў адсутнасць звестак аб прызнанні з боку Мелхіседэка Сергія (Страгародскага), А. Мартас сцвярджаў, што Мелхіседэк падпісаў дэкларацыю аб прызнанні Сергія, а потым быў пераведзены на біскупскую кафедру ў Краснаярск.

Хаця праца А. Мартаса ў абсалютнай большасці прысвечана разгляду гісторыі Праваслаўнай царквы на беларускіх землях, тым не менш, у ёй закранаецца пытанне і аб стане Каталіцкай царквы ў БССР. На думку аўтара, «волна жестокой расправы с православным духовенством захватила также католическое духовенство, хотя не в такой сильной степени, как православное» [5]. На наш погляд, з каталіцкімі святарамі ўлады абыходзіліся не менш жорстка, чым з праваслаўнымі, аб чым сведчаць даследаванні сучасных беларускіх гісторыкаў [8, с. 41–59].

У аналізаванай працы разглядаецца таксама і гісторыя Праваслаўнай царквы на тэрыторыі Заходняй Беларусі, шмат увагі пры гэтым надаецца апісанню яе адміністрацыйнай структуры. Як лічыць А. Мартас, кансерватыўна настроеныя святары не змаглі правільна ацаніць абстаноўку вакол царквы. На яго думку, калі б з самага пачатку праваслаўнае духавенства пачало ўжываць у царкоўным жыцці мову сваіх вернікаў (беларускую мову), гэта б выратавала ад паланізацыі царкоўнага жыцця.

Характэрызуючы стан Каталіцкай царквы ў Заходняй Беларусі, А. Мартас адзначае, што касцёльнае жыццё беларусаў-каталікоў «протекало в чисто польском духе, под влиянием патриотически настроенного польского духовенства». Адмоўную пазіцыю занімае даследчык у адносінах да Уніяцкай царквы. Ён адзначае, што вынікі распаўсюджвання Уніі былі вельмі нязначнымі ў параўнанні «с затраченными огромными усилиями и материальными средствами», пры гэтым робячы выснову, што «православные белорусы оставались верными сынами Православной Церкви и унии не принимали» [5]. Аднак факт існавання пэўнай колькасці ўніяцкіх прыходаў, на наш погляд, сведчыць аб тым, што частка беларусаў усё ж такі ў тыя часы Унію прыняла.

У сваёй працы А. Мартас таксама разгледзеў змены ў кіраўніцтве епархіямі, якія адбыліся пасля ўсталявання савецкай улады ў Заходняй Беларусі [5].

Аўтарам шэрагу артыкулаў, у якіх разглядаецца жыццёвы шлях і дзейнасць грэка-каталіцкіх святароў Ф. Абрантовіча, Я. Германовіча, Л. Гарошкі, а таксама закранаецца гісторыя каталіцкага манастыра ў Друі, з'яўляецца беларускі рэлігійны і грамадскі дзеяч, біскуп Беларускай Грэка-каталіцкай царквы Чэслаў Сіповіч [9]. Гэтыя артыкулы былі надрукаваны ў часопісе «Божым Шляхам» на працягу 50–70-х гг. XX ст., для іх характэрна апалагетычная накіраванасць. Адзначым, што ўсіх вышэйпералічаных святароў Ч. Сіповіч ведаў асабіста, а айцец Я. Германовіч быў яго настаўнікам і выхаваўцам [10, с. 248].

Звесткі па гісторыі хрысціянскіх канфесій ў Беларусі 20–30-х гг. XX ст. у рознай ступені прысутнічаюць ва ўспамінах вядомых прадстаўнікоў беларускай эміграцыі. Так, адпаведныя звесткі ўтрымліваюцца ва ўспамінах (часткова апублікаваных) Л. Гарошкі [11]. У сваіх успамінах ён разважае аб цяжкасцях, з якімі сутыкнулася ўнійная праца ў Заходняй Беларусі і распавядае свой асабісты вопыт удзелу ў ёй. На думку святара, «гаворачы аб вунійнай працы на Беларусі, ні аб чым іншым, як аб цяжкасьцях і гаварыць нельга». Л. Гарошка вылучыў шэраг прычын, якія перашкаджалі развіццю Уніяцкай царквы: непрыхільнае стаўленне да уніі польскага рымска-каталіцкага духавенства і польскага ўраду, варожая прапаганда праваслаўнага духавенства. Ён адзначае, што польскія біскупы і дэканы нічога не рабілі для развіцця уніі, але «затое ўсякімі спосабамі стараліся спыніць яе разьвіцьцё» [11, с. 136–137]. Л. Гарошка прызнае, што «дрэннае рэнамэ ўніяцкай царкве стваралі канвертары з праваслаўя, што па некалькі разоў пераходзілі з адной царквы ў другую, мелі нядобрую маральную славу» [11, с. 137]. Ён адзначае таксама цяжкае матэрыяльнае становішча ўніяцкага духавенства ў якасці адной з прычын нязначнага поспеху Уніі. Усталяванне савецкай улады ў Заходняй Беларусі ў 1939 г., на яго погляд, яшчэ больш пагоршыла ўмовы існавання ўніяцкіх прыходаў [11, с. 140].

Значны ўклад у вывучэнне гісторыі Каталіцкай царквы на землях Заходняй Беларусі ўнёс беларускі рэлігійны дзеяч, грэка-каталіцкі святар, апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў у замежжы Аляксандр Надсан.

А. Надсан з'яўляецца аўтарам грунтоўнага даследавання жыццёвага шляху і дзейнасці біскупа Чэслава Сіповіча [10]. Адзначым, што ў беларускай гістарыяграфіі няма аналагічных прац, прысвечаных Ч. Сіповічу і яго дзейнасці. У сваёй працы ён прыводзіць біяграфічныя звесткі пра Ч. Сіповіча, які нарадзіўся ў Заходняй Беларусі, разглядае ролю ў рэлігійным жыцці Друйскага манастыра айцоў марыянаў [10, с. 7–49].

Больш падрабязна гісторыя каталіцкага манастыра айцоў марыянаў у Друі разглядаецца ў асобнай манаграфіі А. Надсана [12]. Ён прасочвае гісторыю манастыра, пачынаючы ад моманту яго заснавання і да 1938 г. на фоне палітычнай і рэлігійнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі, а таксама на фоне дзейнасці Папскай камісіі Pro Russia. У аснову працы пакладзены архіўныя матэрыялы, большасць з якіх упершыню была ўведзена аўтарам у навуковы зварот. А. Надсан удакладняе час адкрыцця манастыра (называе адпаведную дату – 1924 г.) і падкрэслівае, што гэты манастыр быў заснаваны віленскім біскупам Ю. Матулевічам менавіта «для беларусаў» (pro alborussis) [12, с. 8].

Даследчык адзначае негатыўнае стаўленне з боку польскіх улад і часткі каталіцкага духавенства да распаўсюджвання уніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі [12, с. 74–75]. У працы таксама раскрываюцца сутнасць і мэты ватыканскай палітыкі «навяртання Расіі», якая паўплывала на далейшы лёс друйскіх айцоў марыянаў. Насуперак пануючаму ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі пункту гледжання А. Надсан сцвярджае, што ў Друі ніколі не было ўсходняга абраду, спасылаючыся пры гэтым на перапіску Л. Гарошкі з Ч. Сіповічам [12, с.143]. Разам з тым, друйскія марыяне, на думку А. Надсана, «адчувалі моц, каб працаваць дзеля уніі» [12, с. 136]. Накіраванне друйскіх марыянаў у Харбін дзеля працы сярод расійскіх эмігрантаў, на яго погляд, паклала канец гэтым планам. А. Надсан крытыкуе дадзенае рашэнне духоўных уладаў, сцвярджаючы, што яно адмоўна адбілася на дзейнасці манастыра і насцярожыла тых святароў, што хацелі ў яго ўступіць [12, с. 97]. У працы асвятляюцца абставіны высялення айцоў марыянаў з Друі. Пры гэтым аўтар спасылаецца і на хроніку падзей, складзеную Ч. Сіповічам у тыя часы.

У працах А. Надсана змешчаны характарыстыкі вядомых каталіцкіх дзеячоў 20–30-х гг. XX ст. Ён высока ацэньвае асобу і дзейнасць віленскага біскупа Ю. Матулевіча, які ўзначальваў Віленскую катэдру у 1918–1925 гг., і які, дарэчы, лічыцца блажэнным у сучаснай Каталіцкай царкве [12, с. 10]. У сваю чаргу, аднаго з пераемнікаў Ю. Матулевіча, віленскага біскупа Р. Ялбжыкоўскага А. Надсан называе «польскім шавіністам, які меў алергію на ўсё беларускае», адзначае яго негатыўныя адносіны да развіцця беларускага нацыянальнага руху і друйскіх марыянаў і супрацьдзеянне ім [12, с. 31, 140]. А. Надсан выключна станоўча характарызуе айца Я. Германовіча, адзначаючы, што гэта быў «сьвятар з вялікім пастырскім досьведам, настаўнік, паэт, чалавек глыбокай веры і вялікай дабрыні», у якога «пад сьвятарскай вопраткай білася беларускае сэрца, чулае на боль і крыўду свайго народу». На думку А. Надсана, ад'езд Я. Германовіча ў Маньчжурыю ў 1932 г. стаў вялікай стратай для Друі і беларускага нацыянальнага руху [12, с. 99–100]. У сваю чаргу, Фабіян Абрантовіч, з пункту гледжання даследчыка, гэта «несумненна выдатны чалавек і сьвятар», але, разам з тым, «трагічная фігура, зь якой зьвязваліся нязьдзейсьненыя надзеі многіх беларусаў» [10, с. 247; 12, с. 131].

У адной з прац А. Надсана разглядаюцца погляды княгіні Магдалены Радзівіл на ўніяцкую царкву, а таксама гісторыя брыльянтавага калье, якое яна ахвяравала для заснавання ўніяцкай калегіі для беларусаў у Рыме [13].

Такім чынам, беларускія эмігранцкія даследчыкі разгледзелі ў сваіх працах даволі шырокае кола пытанняў, звязаных з асноўнымі падзеямі гісторыі хрысціянскіх канфесій у БССР і Заходняй Беларусі у 20–30-я гг. XX ст.: рэпрэсіі і пераслед вернікаў у БССР, абнаўленцкі раскол, становішча Праваслаўнай і Каталіцкай цэркваў у Заходняй Беларусі, адраджэнне ўніяцкай царквы і г. д. Асобныя працы прысвечаны вядомым рэлігійным дзеячам таго часу, гісторыі Друйскага манастыра айцоў марыянаў. Аднак недаступнасць архіўных крыніц, якая захоўвалася на працягу існавання СССР, з'яўлялася сур'ёзнай перашкодай для больш глыбокага і дэталёвага вывучэння мінулага.

*Літаратура*

1. *Касяк, І.* З гісторыі Праваслаўнай царквы беларускага народу / І. Касяк. – Нью-Йорк : Выданьне Беларускай Цэнтральнай Рады, 1956. – 190 с.
2. *Навіцкі, У. І.* Змена канфесіянальнай палітыкі дзяржавы ў 20–30-я гг. XX ст. / У. І. Навіцкі // Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.] ; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : ВП Экаперспектыва, 1998. – С. 155–234.
3. *Щеглов, Г. Э.* Автономия Белорусской Православной Церкви 1922 г. / Г. Э. Щеглов // Вестник ПСТГУ. Серия II. – 2011. – Вып. 3 (40). – С. 99–116.
4. *Свирид, А. Н.* Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / А. Н. Свирид ; Брест. гос. ун-т. – Брест : БрГУ, 2012. – 218 с.
5. *Мартос, А.* Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни [Электронный ресурс] / архиепископ А. Мартос. – Буэнос-Айрес, 1966. – Режим доступа : http://pravoslavie.by/page_book/glava-ii-belorusskaja-pravoslavnaja-cerkov. – Дата доступа : 10.09.2016.
6. *Языковіч, Л.* Афанасій Мартас / Л. Языковіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 80.
7. *Гарбінскі, Ю.* Уступнае слова / Ю. Гарбінскі // На ніве Хрыстовай: у пяцідзесятыя ўгодкі сьвятарства 1928–1978. Успаміны. – Нью Ёрк – Менск – Варшава, 2005. – С. 7–19.
8. *Лебедев, А. Д.* Политика советской власти по отношению к Римско-католической церкви в БССР (1919–1929 гг.) / А. Д. Лебедев. – Минск : РИВШ, 2013. – 196 с.
9. *Сіповіч, Ч.* Айцец Архімандрыт Фабіян Абрантовіч / Ч. Сіповіч // Божым Шляхам. – 1957. – № 76–81. – С. 9–20; Ч. С. З жыцьця закону марыянаў / Ч. С. // Божым Шляхам. – 1973. – № 2. – С. 2–4; *Сіповіч, Ч* Архімандрыт Леў Гарошка (26.II.1911 – 28.VII.1977) / біскуп Ч. Сіповіч // Божым Шляхам. – 1978. – № 1 (149). – С. 2–4; Сіповіч, Ч. Сьвятой памяці Айцец Язэп Германовіч / біскуп Ч. Сіповіч // Божым Шляхам. – 1979. – № 150. – С. 25–30.
10. *Надсан, А.* Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус / А. Надсан. – Мінск : БелФранс, 2004. – 300 с.
11. *Гарошка, Л.* Праз навальніцы й нягоды. Успаміны з гадоў 1930–1944. Фрагмэнты / айцец Л. Гарошка // Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі. – Нью-Ёрк, 1999. – С. 135–144.
12. *Надсан, А.* Pro patria aliena: Кляштар беларускіх айцоў марыянаў у Друі (1924–1938) / А. Надсан. – Менск, 2006. – 160 с.
13. *Надсан, А.* Княгіня Радзівіл і справы адраджэньня Уніі ў Беларусі / А. Надсан. – Мінск, 2006. – 110 с.

*References*

1. *Kasyak, I. Z.* Z gistoryi Pravaslaunay tsarkvy belaruskaga narodu / I. Kasyak. – Nyu-York, Vydannye Belaruskay Tsentralnay Rady, 1956. – 190 s.
2. *Navitski, U. I.* Zmena kanfesiyanalnay palityki dzyarzhavy u 20-30-ya gg. XX st. / U. I. Navitski // Kanfesii na Belarusi (k. XVIII-XX st.) / V. V. Grygoryeva [i insh.] ; navuk. red. U. I. Navitski. – Minsk : VP Ekaperspektyva, 1998. – S. 155-234.
3. *Shcheglov, G. E.* Avtonomiya Belorusskoy Pravoslavnoy Tserkvi 1922 g. / G. E. Shcheglov // Vestnik PSTGU. Seriya II. – 2011. – Vyp. 3 (40). – S. 99-116.
4. *Svirid, A. N.* Uniatskaya tserkov v Zapadnoy Belarusi (1921-1939 gg.) / A. N. Svirid ; Brest. gos. un-t. – Brest : BrGU, 2012. – 218 s.
5. *Martos, A.* Belarus v istoricheskoy, gosudarstvennoy i tserkovnoy zhizni [Elektronnyy resurs] / arkhiyepiskop A. Martos. – Buenos-Aires, 1966. – Rezhim dostupa : http://pravoslavie.by/page_book/glava-ii-belorusskaja-pravoslav¬naja-cerkov. – Data dostupa : 10.09.2016.
6. *Yazykovich, L.* Afanasiy Martas / L. Yazykovich // Entsyklapedyya gistoryi Belarusi : u 6 t. / Belarus. Entsykl. ; redkal.: G. P. Pashkou (gal. red.) [i insh.]. – Minsk, 1997. – T. 5. – S. 80.
7. *Garbinski, Yu.* Ustupnaye slova / Yu. Garbinski // Na nive Khrystovay: u pyatsidzesyatyya ugodki svyatarstva 1928-1978. Uspaminy. – Nyu-York – Mensk – Varshava, 2005. – S. 7–19.
8. *Lebedev, A. D.* Politika sovetskoy vlasti po otnosheniyu k Rimsko-katolicheskoy tserkvi v BSSR (1919–1929 gg.) / A. D. Lebedev. – Minsk : RIVSh, 2013. – 196 s.
9. *Sipovich, Ch.* Aytsets Arkhimandryt Fabiyan Abrantovich / Ch. Sipovich // Bozhym Shlyakham. – 1957. – №76–81. – S. 9–20; Ch. S. Z zhyttsya zakonu maryyanau / Ch. S. // Bozhym Shlyakham. – 1973. – № 2. – S. 2–4.; *Sipovich, Ch.* Arkhimandryt Leu Garoshka (26.II.1911 – 28.VII.1977) / biskup Ch. Sipovich // Bozhym Shlyakham. – 1978. – № 1 (149). – S. 2–4.; Sipovich, Ch. Svyatoy pamyatsi Aytsets Yazep Germanovich / biskup Ch. Sipovich // Bozhym Shlyakham. – 1979. – № 150. – S. 25–30.
10. *Nadsan, A.* Biskup Cheslau Sipovich: svyatar i belarus / A. Nadsan. – Minsk : BelFrans, 2004. – 300 s.
11. *Garoshka, L.* Praz navalnitsy y nyagody. Uspaminy z gadou 1930-1944. Fragmenty / aytsets L. Garoshka // Belaruskaya memuarystyka na emigratsyi. Nyu-York, 1999. – S. 135–144.
12. *Nadsan, A.* Pro patria aliena: Klyashtar belaruskikh aytsou maryyanau u Drui (1924–1938) / A. Nadsan. – Mensk, 2006. – 160 s.
13. *Nadsan, A.* Knyaginya Radzivil i spravy adradzennya Unii u Belarusi / A. Nadsan. – Minsk, 2006. – 110 s.